Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 40 (539). Вільня, Нядзеля 19 Лістапада 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Завальная вул. 1-1. (Wilno, ul. Zawalna 1-1). Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Сталася тое, што мусіла стацца.

(Да апошніх падзеяў у ТБШ.)

„Тое, што сталася" — пад гэткім загалоўкам у № 10 піша „Бел. Газэта" аб падзеях у Т-ве Беларускае Школы. Сталася-ж тое, што „генэралы" не падзялілі між сабой уплываў і свайго значэньня ў Т-ве, а прадусім не дагаварыліся, дзе ў ім мае канчацца палітыка Варшавы і дзе мае пачынацца палітыка Масквы. Сумна гэта, ды праўдзіва!..

Але бліжэй да справы. Сяньня ўжо ўсім стала ясным, што „Грамада" і арганізавалася і ліквідавалася пры выдатным удзеле Масквы і Варшавы. Ясна сяньня ўсім, што ў „Грамадзе", вобак з праўдзівымі беларускімі ідэовымі барацьбітамі, аж раілася ад маскоўскіх і варшаўскіх дэфэнзыўшчыкаў.

Вобак з палітычнай арганізацыяй „Грамадой" існавала і існуе да сяньня арганізацыя культурная Т-ва Бел. Школы. Праца гэтага Т-ва на ніве беларускай культуры таксама не давала супакою агентам Масквы і Варшавы, якія як і ў „Грамадзе" знайшліся і тут і якія вытрывала, усякімі спосабамі, праводзілі тую-ж, так ужо нам ведамую, сваю работу — узрываць і руйнаваць беларускую самастойную нацыянальную, хоць-бы і чыста культурную, арганізацыю.

У мінулым годзе, у Беластоку, адбыўся зьезд ТБШ, на якім была прынята рэзалюцыя, заклікаючая ня толькі сяброў ТБШ, але проста ўвесь народ беларускі да супрацоўніцтва і ўгоды з палякамі. Да нашага ведама гэная полёнофільская, наскрозь палітычная рэзалюцыя, пушчаная „генэраламі" ў сьвет ад імя культурнага Т-ва, дайшла праз варшаўскія „Sprawy Narodowościowe".

З прычыны гэнай рэзалюцыі мы ў свой час для агульнага дабра паднялі алярм, зварочваючы ўвагу чэсных сяброў ТБШ на тое, што ў іх нутры дзеецца небясьпечная і шкодная работа, шкодная агулам для беларускага народу, а прадусім іменна для шырокіх нізоў, для працоўных масаў, якімі „генэралы" таргуюць „оптом і в розніцу". Наш алярм у кіраўнічых кругох ТБШ і ў іх прэсе быў збыты крыху жартам, крыху недарэчным адказам, а пераважна маўчком: „знаем — мол — что делаем".

Але вецер заўсёды ветрам: адкуль узьдумае, адтуль павее. Надзьмуўся з захаду, прынасячы ў ТБШ успомненую рэзалюцыю, пачаў дзьмуць з усходу аб тым „Што сталася" ў ТБШ, а пасьля ўзноў падзьме з захаду. Вецер, як вецер, ён куды хоча — туды дзьме і ён крыжуецца: і адсюль і адтуль вее і туды і сюды дзьме...

Гэна рэзалюцыя — гэта яўная здрада працоўных і дапусьціўся яе Марцінчык — алярмуе ў „Бел. Газэце" Карповіч. Пэўне-ж, у Карповіча на гэтулькі розуму хопіць, каб рэзалюцыю гэту выкарыстаць для „свае" сэзоннай „палітыкі". І ён гэта робіць, ён сваё часовае заданьне спаўняе.

Але што робяць у ТБШ розныя ветрагоны, нас цікавіць настолькі, наколькі яны шкодзяць беларускаму народнаму адраджэньню, наколькі туманяць беларускія масы і прыкрыўшыся працоўнасьцяй і радыкальнасьцяй — уводзяць у свае цянёты беларускую ідэйную сялянскую і мяшчанскую інтэлігенцыю.

Усім павінна быць ясна, што і гэная леташняя рэзалюцыя і апошні процiў яе выступ „Бел. Газэты"—гэта ўсё разьлічана на ўзрыў тэй культурнай і грамадзкай работы, якую чэсныя і ідэовыя сябры ТБШ праводзяць сярод беларускіх працоўных масаў. Сэзонны адвакат ТБШ Карповіч сваім за гэту арганізацыю заступніцтвам можа ёй толькі зашкодзіць. І яму — пэўне-ж — аб гэта і расходзіцца. Ён-жа пастаўлены на тое, каб таптаць беларускае народнае адраджэньне. Хто чытае „Бел. Газэту", той бача, што Карповіча заданьне біць па беларусах, хваліць безагляднa СССР і маўчаць аб тым, як нашаму народу жывецца ў Польшчы. А гэткі адвакат ТБШ не паможа, а толькі пашкодзе.

Вось-жа паўтараем, чэсныя і ідэовыя сябры ТБШ кіравецтва гэтай арганізацыі павінны браць у свае рукі і з сваей культурнай, заслужанай для бел. народу, арганізацыі, розных палітыканаў, прыношаных на нашыя землі то ўсходнім, то заходнім ветрам, павінны ад сябе гнаць якнайдалей.

„Тое, што сталася" — мусіла стацца і ставацца будзе далей, аж покуль цалкам ня будзе зруйнавана ТБШ, калі толькі чэсныя сябры гэтай арганізацыі не пазнаюцца на рознага роду правакацыях, ня станучь на свае ўласныя ногі і проч ад сябе не пагоняць ваўкоў у авечай скуры. А час, вялікі час зрабіць гэта!...

Самаўрадавыя выбары бяз выбараў.

Ва ўсей Польшчы ад пачатку г. м-ца праводзяцца самаўрадавыя выбары раднікаў у Рады Грамадаў, якія будуць выбіраць гмінныя рады, а апошнія — гмінныя ўлады: войтаў, падвойтаў і лаўнікаў.

Гэткія выбары адбываюцца і ў нашым краю. У Навагрудзкім і Беластоцкім ваяводзтвах пачаліся гэтыя выбары 8 г. м., а ў Віленскім ваяводзтве 10 г. м.

Паводле газэтных вестак ва ўсей Польшчы гэтыя выбары праходзяць у большасьці мясцох бяз выбараў, г. зн. паяўляецца сьпісак раднікаў Б.Б.С.зУ., другіх сьпіскаў няма і справа кончана. Усе без галасаваньня становяцца „выбранымі."

Гэтак, як нас інфармуюць і як падаюць польскія газэты, праводзяцца самаўрадавыя выбары і ў нашым Краю, толькі больш пасьпешна і больш інтэнсыўна — адналіта і з энэргічней "умеласьцяй,"як па нотах.

З боку сялян — выбаршчыкаў ня мала ўжо есьць нездаволеньня гэткімі выбарамі, на якія падаюць жалабы цэлымі грамадамі з подпісамі ад 800 да 1.000 асоб. Падпісваюць гэтыя жалабы нават і новавыбраныя раднікі, якія хоць і далі згоду кандыдаваць на казённым сьпіску, але ня выракліся сялян.

Зам ла йшчэ маем вестак з мясцоў, каб цалкам апісаць ход гэтых няштодзенных, бо надта-ж на новы лад абдуманых, выбараў ва ўсім Краю. Спадзяёмся, што аб гэтых выбарах беларускія сяляне не забудуцца напісаць і ў газэту. Дык тады да гэтай справы яшчэ вернемся. А цяпер пару слоў аб самаўрадзе.

Самаўрад мае вялікае значэньне для Краю. Рэч зразумелая, добры самаўрад, а не пародыя самаўраду. Добры самаўрад гэта першая праўная абарона сялянскіх інтарэсаў і галоўны цэнтр гаспадарча-эканамічнага абнаўленьня Краю.

Ці будзе гэткім самаўрад польскі на беларускіх землях, які цяпер так пасьпешна родзіцца, спадзявацца ня прыходзіцца. Ужо ад самага пачатку — ад першых выбараў, прадстаўляецца вобраз анэмічна кволага вялікана, які хоць нібы і жыве, але жыцьця ня мае і сваім існаваньнем зьяўляецца цяжарам для акружаючых. А гэткім можа быць таму, што ў гэтым арганізьме ня будзе здаровай крыві, якая ўліваецца сапраўднымі выбарамі.

Дык будзем прыглядацца да падзеяў, якія запачаткаваў у нашым Краю ў самаўрадавым жыцьці гэты нябывалы спосаб выбараў... бяз выбараў.

П—К.

Прамова пасла Ф. Яраміча

на паседжаньні Сойму 3 лістапада 1933 г.

(Паводле стэнаграмы).

Высокі Сойме! Прамова п. прэм'ера Енджэевіча была вельмі оптымістычная. Паводле яе, гаворачы расейскай пагаворкай, — „На Шыпке всё спокойно", п. прэм'ер як-бы ўжо спачывае на ляўрах. Я аднак, як прадстаўнік Беларусоў, не згаджаюся з п. прэм'ерам, бо ведаю як гэты спакой выглядае і не магу сказаць, каб спакой на нашых землях, а нават і на землях чыста польскіх быў. Аб гэтым зрэшта сьведчаць і масавыя палітычныя сялянскія працэсы.

Памінаючы землі польскія, буду гаварыць аб землях беларускіх, лёс якіх мяне найбольш абходзіць. Супакой гэты, якім хваліцца п. прэм'ер, беларускі народ вельмі моцна адчувае і прыпячатваў яго сваею крывёю. Гэты спакой уводзіцца пры помачы сшыбеніцаў, каторыя скрыпяць на беларускіх землях і дзякуючы дзейнасьці ліквідатара беларускага школьніцтва п. міністра Енджэевіча, каторы ўсе нашы школы пазачыняў. У нас усялякія правы жыцьця культурнага, эканамічнага і палітычнага стэрорызаваны, а да таго дзеіць усьцяж правакацыя, сягаючы нават у беларускія гімназіі. Ня буду аб гэтым падрабязна гаварыць, бо калегі з Украінскага Клюбу справу гэту шырока ўжо прадставілі, ды ў гэтай справе я падаваў ужо інтэрпэляцыю, якая аднак нічога не памагла, бо людзі, якія праводзілі гэтую правакацыю, сядзяць непакараны на пасадах і ў гэтай справе ня было нават праведзена сьледзтва.

Так вось выглядае спакой.

Польская палітыка ад самага пачатку, а тым-больш за часоў т. зв. урадаў памаёвых, ідзе ў кірунку зьнішчэньня беларускага народу.

Далей перайду да польскай палітыкі заграрнічнай, якая апошнім часам пашла ў кірунку згоды з С.С.Р.Р., стваракчы пакт аб неагрэсіі (аб узаемным ненападаньні — п е р а к л.). Вось-жа пакуль ня было гэтага пакту, з беларускім народам па той старане граніцы пануючыя там улады лічыліся і дзякуючы гэтаму беларускі народ у сваім жыцьці здабыў некаторыя ўступкі ад Масквы і мог вясьці на чале з сваей інтэлігенцыяй культурную працу. Чырвоны маскоўскі імпэрыялізм, баючыся сэпаратызму з боку беларусоў і украінцаў, стараўся ўсю іх працу здушыць, ня сьмеў аднак адкрыта да гэтага прыступіць, пакуль не дайшоў да поўнае згоды з сваім заходнім суседам. Пасьля гэтага ён у барбарскі спосаб пачаў распраўляцца і распраўляецца з усімі праявамі беларускага і украінскага народу, нішчачы іх фізычна і маральна. Беларускіх сялян, якія спраціўляліся колектывізацыі, каторая есьць ім чужой, нявыгоднай, ды да каторай яны ня прызвычаены, будучы ад вякоў індывідуалістамі, чырвоны маскоўскі імпэрыялізм мільёнамі высылае ў сібірскія тайгі дрэва рубаць, адкуль яны бязумоўна ўжо не варочаюцца. Тое самае робіцца і з беларускай інтэлігенцыяй з краю, а нават у падступны спосаб сьцягнутай

У абароне Царквы і духавенства.

Пішучы аб усіх ненармальнасьцях, ў жыцьці нашай Царквы, мы маем на мэце не абражаньне прав. Гіерархіі, але дапамажэньне ёй у запыненьні недахопаў. Калі нават часамі і здарыцца слова больш вострае, слова горкае праўды, то і ў гэтым выпадку мы найменш вінаваты. Векавая траўля беларуса, ігнараваньне яго мінімальных і слушных дамаганьняў, абапёртых на пастановах Сьв. Сыноду, разбураньне Царквы і дэмаралізаваньне народу — усё гэта прычыны, якія могуць зьвесьці з роўнавагі кожнага чалавека. Аднак, пры ўсім гэтым, мы заўсяды імкнемся дапамагчы Царкве і Гіерархіі. Гэная апошняя таму павінна да голасу беларускага ўважна прыслухоўвацца, не даглядацца ў просьбах беларусоў таго, чаго яны на думцы ня маюць. Усе просьбы беларусоў павінны быць урэшце паступова рэалізаваны. Мы пэўны, што пры гэткіх суадносінах між беларусамі і Гіерархіяй ніякіх непаразуменьняў ніколі ня будзе.

Усе нашы натугі, як было сказана вышэй, накіраваны на узмацненьне Царквы. Падставаю гэтага будуць: 1) правядзеньне беларусізацыі Царквы і 2) абаперце яе жыцьця на асновах саборнага строю. Ажыцяўленьне гэных двух постулятаў якраз зблізіць духавенства з народам, зьвяжа іх з сабой у адну неразрыўную суцэльнасьць. Запыніцца тады з аднаго боку дэмаралізацыя народу, з другога—трагэдыя сельскага духавенства, а разам гэта дасьць моц Царкве. Аб тым, як наш народ дэмаралізуецца сяньня, нашым Гіерархам добра ведама і з бязьліку мэморыялаў і з галасоў прэсы. Аб тым, якую трагэдыю перажывае сельскае духавенства, пісалася таксама часткова, аднак дадамо тут яшчэ некалькі фактаў, гаворачых аб патрэбе неадкладнае дапамогі духавенству.

Сельскае духавенства ў пераважнай, большасьці сяньня зусім зруйнавана. Значная частка яго жыве ў абставінах горшых чымся наша сялянства. Цэрквы, як ведама, абкладаюцца **даслоўна непамернымі** цяжарамі, пад відам дзесяткаў розных падаткаў, ахвяраў і т. д. Цэрквы сваіх грошаў ня маюць, бо сялянства перастае плаціць, бачучы ў царкве ня дом Божы, а палітычны і сабе варожы цэнтр. Грошы, якія яшчэ часам і ўдаецца сьцягнуць, ідуць не на адбудаваньне Цэркваў, але на ўтрыманьне розных протэгаваных асоб, панасаджаваных беспатрэбна ў Кансысторыях, на падтрыманьне палітычнае прэсы і т. д. Мала таго, мы чуем штораз часьцей аб прадажах царкоўных маемасьцяў ды розных скандалах (на ўзор Пінскае Кансысторыі). Усё гэта ўзноў падрывае працу сельскага духавенства і моральна і матэрыяльна. І мы бачым, што Віл. Эпархія мае даўгоў нешта 10.000 зал., Пінская Эпархія блізу 20.000, а Горадзенская дык быццам аж 30.000 зал. Гэныя грошы Кансысторыі (асабліва Віленская) намагаюцца сьцягнуць, часамі папросту шляхам службовага тэрору, г.зн. пазбаўленьнем пасады тых сьвяшчэньнікаў, каторыя ня могуць сваімі грашыма заплаціць царкоўныя даўгі (сьв. Ул. Савіцкі, сьв. Міх. Эрдман і інш.). Гэткае пастапаньне зьнеахвочывае духавенства да працы, трагэдыю яго зьвялічвае да апошніх межаў, а і народ гэткае пастапаньне абурае йшчэ горш.

Вось-жа, у імя дабра Царквы, мы дамагаемся, каб нашыя Гіерархі гэныя анормальнасьці запынілі. Запыніць іх можна. Трэба толькі крыху ачысьціць рады дармаедаў, якія абсеўшы розныя ўстановы духоўныя, як павукі смокчуць сокі Эпархіі, разьядаючы нашае праваслаўнае нутро сваім палітычным хіжацтвам. Трэба зьменшыць урэшце ўсе тыя вялічэзныя і бязлікія падаткі царкоўныя, якія нашае духавенства даводзяць да жабрачае торбы.

Нямаючы нічога супроць Гіерархаў, мы варожа адносімся да т. зв. „акружэньня“ іх, якое сяньня зьяўляецца вялікаю прычынай агульнага непарадку. Гэта ўсім добра ведама! Духавенства сельскае ня мае патрэбы іх утрымліваць, Гіерархія павінна гэныя „акружэньні» зьліквідаваць, бо йнакш жыцьцё Царквы можа апынуцца на бездарожжах анархіі. А да гэтага ўжо ідзе!

Прав. Беларус.

З беларускага жыцьця.

Трэба ажывіць тэатр. У апошнія гады беларуская сцэна ў Вільні звузілася да разьмераў хатняй забаўкі. Ладжаныя беларускія прадстаўленьні ня ставіліся на шырэйшы паказ, а толькі ў сваім, казаў-бы сямейным кружку. Ды й ня дзіва, ня было мастакоў тэатральнай сцэны—ня было каму пакіраваць фахова беларускай сцэнай; дык беларускі тэатр у Вільні, таксама як і на сяле, знаходзіўся ў руках аматараў.

Ня так даўно, бо толькі пару месяцаў таму, вярнуўся з савецкай катаргі ў Вільню ведамы беларускі драматург-мастак беларускай сцэны Фр. Аляхновіч і, як чуваць, узяўся за арганізацыю беларускага тэатру. Даведваемся, што ажыўленьне беларускага тэатру грам. Аляхновічам ужо запачаткавана і што кіраваны ім тэатр мае на ўвазе толькі беларускую сцэну, а не палітыку. Гэты пачын грам. Аляхновіча беларускае грамадзянства павінна прывітаць і належна падтрымаць, каб супольнымі сіламі ажывіць у Вільні беларускі тэатр.

З студэнскага жыцьця. Дня 12 г. м. адбыўся звычайны гадавы агульны сход Беларускага Студэнскага Саюзу У.С.Б. Аб выбарах прэзыдыуму Саюзу і пастановах сходу падамо ў наступным нумары.

Т-ва Прыяцеляў Беларусаведы пры Віленскім Унівэрсытэце ладзіць у нядзелю 19 г. м. ў салі VII Унівэрсытэту II-ую наву-

з эміграцыі, быццам да культурнае працы ў БССР. Гэтую інтэлігенцыю з воўчым білетам высылаюць у глыб Расеі, дзе яна ня можа дастаць ніякай працы і дзе мусіць гінуць з голаду.

Сяньня чутны былі тут галасы, нават з боку польскае лявіцы, пахваляючыя заграчічную палітыку ўраду ў адносінах да СССР. Так, Вы Панове ўсе задаволены з таго, што польскі ўрад з маскоўскім працягнулі да сябе рукі над галовамі беларускага і ўкраінскага народаў і што коштам гэтых народаў зацясьняеце сваю прыязьнь. Гэты вялікі кошт апіраецца на мільёнах ахвяр. На гэтых беларуска-украінскіх могілках маскоўскі ўрад пасяляе сваіх прававерных камуністаў-маскалёў. Карэньні аднак, якія яны пушчаюць, могуць зайсьці задалёка і можа Вы яшчэ будзеце шкадаваць гэтага экспэрымэнту. — Гісторыя пакажа, — а можа і мы яшчэ будзем жыць, то прыпомнім аб гэтым польскаму грамадзянству. Народ беларускі перажыве гэтыя экспэрымэнты, як перажыў многа ім падобных.

Да ўраду п. прэм'ера Енджэевіча даверу ня маю і буду галасаваць процiў бюджэту.

Keturakis.

Ameryka ŭ łaźni. 5)

Kamedyja ŭ troch dziejach.

Z litoŭskaj mowy pierakłaŭ
St. Marcinkiewič.
(Praciah, hl. „Bieł. Krynicu“ Nr. 39).

W i n c u k (*biaručy za ruki Agatu*). Agatka, jak mianie widziš žywoha: jak ja tolki na ciabie pahladžu, to mnie ŭsio zdajecca, što tabie nia hetkaha žyćcia treba.

A g a t a (*ździŭlona*) A jakoha?

W i n c u k (*trymajučy jaje ruki*). Hetkimi ručkami nie ciažkuju rabotu rabić, imi tolki zołata pierasypać.

A g a t a. Śmiaješsia z mianie, bolš ničoha.

W i n c u k. Śmiaješsia! Ale kab ty tolki wiedała, jak mnie ciabie škoda, to ty tak nie hawaryła-b; kab tolki zmoh, to ja jaho, zdajecca, zadušyŭ-by. Ja, zdajecca, niawiedama čaho nie pažaleŭ-by, kab tolki ty jamu nie dastałasia: jon ciabie za adzin hod u mahiłu zahonić! zahubić...

A g a t a (*ździŭlena*). Što! mianie za hod zahubić? Chto?

W i n c u k (*nia słuchajučy jaje*). Hetkamu trutniu, Miadźwiadziu, hetkaja dziaŭčyna, kab jon nie dačakaŭ!

A g a t a. Chto trucień? Chto kab nie dačakaŭ? Ab kim ty, Wincuk?

W i n c u k (*chwatajučy siabie za haławu chutka chodzić*). E! čort za jazyk paciahnuŭ: i nie ahledziŭsia, jak prahawaryŭsia, a jany mianie prasili tak chutka nie hawaryć.

A g a t a. Nie hawaryć? Chto prasiŭ nie hawaryć?

W i n c u k. A čym ja winawat, što ŭsiu noč nia moh zasnuć ad hetaha kłopatu? Ja nie mahu... ja jamu, ci sabie jaki-niebudź kaniec zrablu!

A g a t a. Dapraŭdy, što tut jamu zrabiłasia: sam nia wiedaje, što placieć.

W i n c u k (*stojačy suproć Agaty*). Ja nia wiedaju, što platu! A hdzie-ž ciapier twoj baćka? Hdzie jon, što robić — ty wiedaješ?

A g a t a. Wyjechaŭ; a hdzie-ž jon budzie?

W i n c u k. A kudy jon pajechaŭ, čaho pajechaŭ—ty znaješ?

A g a t a. Ci-ž jaho sačyć budzieš; jon tak dzień ŭ dzien raźjaždžaje... chto moža wiedać?

W i n c u k. Ty, Agatka, nia znaješ, a ja ŭsio znaju, i ciapier užo nie zmaŭču, ja nie mahu maŭčać, kab jany mnie zołatam horła zasypali. I pa što-ž jany sakratujuć, kali dabra žadajuć? Ja jašče jak žywu nia čuŭ, kab baćka swaju dačku tak pradawaŭ!

A g a t a (*biaručy Wincuka za ruki*). Wincučok, sakolik! kažy: ty niešta wiedaješ, ty ŭsio wiedaješ; ty mnie pawinien skazać! Dziela čaho baćka pajechaŭ?

W i n c u k. Jon ciabie pradać pajechaŭ! Nu što!

A g a t a (*ździŭlona*). Mianie pradać?! Nu ž i skazaŭ: a jak-ža jon mianie pradaść?

W i n c u k. Jon ciabie pradaieć z ciełam, z dušoj za 200 dalaraŭ. I kamu pradajeć: trutniu, skneru, basiaku; jon taboj ŭsio žyćcio budzie harać i baranawać; ŭžo ja jaho dobra wiedaju. Ty choć-by pamirała, hraša ŭ jaho nia wyprasiš, ty ŭ jaho horš, jak słužkaj budzieš. Dyj što tut kazać! Ja jaho wiedaju.

A g a t a. A chto-ž jon taki: Wincučok, kałasok! tolki užo kažy, što wiedaješ!

W i n c u k. Skazać to ja skažu, ale ŭsiaroŭna — z hetaha ničoha nia budzie. Kab ty mianie pasłuchała...

A g a t a. Wincučok! tolki kažy, ja ŭsio zrablu, što budzieš kazać—uwidziš—pasłuchaju.

W i n c u k. Ty peŭnie wiedaješ, što twoj baćka zaŭsiody hrošy šukaje pazyčać, swaich — bačyš —nie staje horła zalić; tolki ciapier jamu nia nadta chto daje; ale hdzie jon nia bywaje! Tut blizka nia moža dastać, to jon papiorsia až u dziesiatuju parafiju i tam ačmuciŭ niejkaha herada — chłapca, što čašć ad brata adabraŭšy; dyk jany ŭdwuch zhawarylisia: chłapiec ciapier daje dźwieście dalaraŭ, paśla jašče skolki prykinie, a baćka twoj apiša jamu ŭsio; chłapiec prydzie da was haspadaryć i was ŭsich budzie krucić, jak zachoča. O, ja jaho dobra wiedaju: ŭžo jon kali čaho zažadaje, toje i zrobić. Dyk ciapier razumieješ?

A g a t a. Niedačakańnie jaho, kab heny złydzień sa świetu siudy prywałoksia i kirawaŭ nami. My z mamaj kačarhoj jaho praprom, tak što i dźwiarej nia znojdzie. Ja tolki słuchaju... Niaŭžo-ž i baćka ŭžo rozum zhubiŭ. Hdzie-ž jaho byli wočy?

W i n c u k. Haworyš — baćka, jon ciapier jak pa milijonnym wyjhryšy: kab ty pačuła, jak jon z henaha durnia ciešycca, jak jaho chwalić, to ty tak-by nie hawaryła; ty-ž sama siańnia widzieła, jak jon wiasioła wybiraŭsia.

A g a t a. Dyj sapraŭdy! praŭdu ty kažaš: jon tak śpiašaŭsia, ale pra ziacia nia ŭspomniŭ.

W i n c u k. Heny taki sknera, taki chitry: jon, widziš, ličyć na toje, što ciapier dašć dźwieście, paśla jašče trochi prykinie i nad ŭsim panam, a skolki daŭhu zastaniecca, to za jaho ciabie zaješć: „twoj baćka narabiŭ doŭhu“ — skaža.

A g a t a A kab jon nie dačakaŭsia, kab jon na marach wyciahnuŭsia!

W i n c u k. Ale što ty, huska, zrobiš? Jon baćku prosta začarawaŭ: jak tolki jon haworyć, to baćka na ŭsio prystajeć; bo baćku patrebny hrošy, dyk čamu-ž nie pradać dačku za dźwieście dalaraŭ? .. Nie! ŭžo kali jon uprecca, to ničoha ty, dziaŭčyna, nia zrobiš; dastanieššia ty jamu, a paśla haruj da mahiły.

A g a t a. O, kab jon nikoli nie dačakaŭ!

W i n c u k. A kab ža ty uwidzieła, što heta za mužčyna: maleńki, kulhawy, harbaty, ničoha nia warty, brydka i pahladzieć; a ŭžo za hroš — dyk pawiesiŭsia b! (d. b.)

кову зборку з лекцыяй кал. М. Пецюкевіча на тэму: „Пахаронныя абрады ў Славян,“ ч. II. „Дні прысьвячаныя памёршым.“ Пасьля лекцыі дыскусыя. Пачатак а гадз. 17-ай пункт.

Судовы працэс над вучнямі Наваградзкай Беларускай гімназіі. Сёлетняе лета на вокал Наваградзкай Беларускай гімназіі было вельмі хмарнае. Арышты вучняў і сваяроднае сьледзтва, якое было раскрыта пасольскай інтэрпэляцыяй, паказваюць якія хмары хадзяць над Наваградзкай Беларускай гімназіяй. Як прадстаўляецца справа сваяроднага сьледзтва, выяўленага інтэрпэляцыяй, — нявядома. Але вось ведама, што сьледзтва ў адносінах да б. вучняў беларускай гімназіі закончана і абвінавачаным ужо даручачы акт абвінавачаньня. Абвінавачаны б. вучні ад 5 да 8 клясы: Анішчык, Літвін, Чэрнік, Вінар, Гуль, Главінская, Ханько, Алексеевіч і Еўтухоўская.

Цікавы гэта будзе працэс, бо ўжо цяпер абсарбуе сабою ўсю Навагрaдчыну.

„Беларуская Школа ў Латвіі“ (№ 6. (23) жнівень—верасень 1933 г.) падае даволі абшырна аб дзейнасьці беларускіх навуковых інстытуцыяў і культурна-прасьветных арганізацыяў у Латвіі.

З гэтага журналу даведваемся, што Беларусы і ў Літве дамагаюцца роднай беларускай школы.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

Дальшая полёнізацыя Ўсходняй Беларусі. Пасьля пэратварэньня Койданаўскага раёну ў раён нацыянальна польскі, пачалася полёнізацыя ў Усх. Беларусі ўзмоцненым тэмпам. Савецкія ўлады далі дазвол польскаму Студэнскаму Саюзу ў Менску арганізаваць прапаганду польскага слова ў БССР., а так-жа сарганізаваць польскі аб'язны тэатр, які пачаў ужо сваю работу на беларускай вёсцы. Пачала так-жа выходзіць у Менску новая польская газэта „Kamunista Polski,“ якая мае на мэце „бараніць“ нацыянальна-польскія інтарэсы ў Б.С.Р.Р.

З Літоўскага жыцьця.

Водгукі Задушкаў. У мінулым нумары мы пісалі аб тым, што адміністрацыйныя ўлады забаранілі Віленскім Літоўцам ісьці ў дзень Задушны з працэсіяй на могілкі і што, калі Літоўцы на гэных могілках пазьбіраліся, дык не абышлося без скандалу.

Цяпер даведваемся, што аб выпадках на могілках сьв. Пятра і Паўла вядзецца сьледзтва. Палітычная паліцыя заклікала тых літоўскіх студэнтаў, якія быццам пяялі на могілках літоўскі народны гымн і выпытвала ў іх, як з гэтым усім было.

На гэта можна толькі сказаць, што паліцыя мусіць ня мае чаго лепшага да работы.

Кандыдаты на лектароў літоўскай мовы. У Віленскім Унівэрсытэце літоўскую мову выкладаў у мінулым акадэміцкім годзе Кс. П. Краўяліс. Цяпер, па Яго сьмерці, на гэта месца, як піша „Viln. Rytojus“, ёсьць аж тры кандыдаты: студэнт (эмігрант з Коўны) П. Анцэвіч, нейкі бугальтар Кавальскі і кс. А. Віскант. Цікава, што ў прафэсары мецяць студэнта і бугальтара!... Z.

З Польшчы.

15-ыя ўгодкі незалежнасьці Польшчы. Сёлета мінула ўжо 15 гадоў незалежнага існаваньня Польскай дзяржавы. Угодкі незалежнасьці Польшчы прыпадалі 11 лістапада. У гэты дзень у Варшаве і іншых гарадох Польшчы адбылася вайскова-чыноўніцка-народная маніфэстацыя.

Абкраданьне скарбу. На ўрачыстасьць 15-ых угодкаў незалежнасьці Польшчы даваліся зьніжковыя білеты на праезд у Варшаву з правінцыі і назад. На гэтай справе лаўкачы ўздумалі зарабіць і ўзяліся за дзела. Нейкая грамадзкая арганізацыя ў Варшаве разаслала па ўсей Польшчы ў „Orbis“ свае легітымацыі, а „Orbis“ выдаваў пасьля зьніжковыя білеты па гэтых легітымацыях, бяручы надплату „за легітымацыю“.

Спасьцераглі гэту афэру ў Вільні, адкуль ніткі вядуць у Варшаву, а з Варшавы па ўсей Польшчы.

Па аблічэньні ў аднэй Вільні скарб на гэтай справе мае 7 тысяч зл. страты.

Польска-нямецкае збліжэньне. Польская прэса з грымучымі загалоўкамі падае вестку, што польскі пасол у Бэрліне адведаў Гітлера, які гутарыў з прадстаўніком Польшчы аб патрэбе нямецка-польскіх перагавораў у справах датычачых абодвух краёў.

Трэба спадзявацца, што гэткія перагаворы між Польшчай і Нямеччынай пачнуцца, але ці яны давядуць да ладу, спадзявацца тымчасам трудна.

Даўгі Польшчы. Паводле даных міністэрства скарбу, Польшч мае доўгу на 1.X. с. г. — 4253,1 мільёнаў зл. Нутранога доўгу – 429,6 мільён. зл. і 3823,5 мільён. зл. доўгу загранічнага.

Украінскія інтэрпэляцыі ў Сойме. На апошнім засяданьні Сойму Украінскі Пасольскі Клюб падаў дзьве чарговыя інтэрпэляцыі да міністра ўнутраных спраў: № 137 у справе пабояў тайнай паліцыяй у Берасьці Ф. Мечука і № 138 у справе спосабу паліцэйскай рэвізіі ў Украінскім Акадэміцкім Доме ў Львове.

Падвышэньне грунтовага падатку. Законам з дня 27.X. с. г. грунтовы падатак падвышаны на 10 прац. Такім чынам хто плаціў напр. 20 зл. гэтага падатку, той цяпер будзе плаціць 22 зл.

Польскі суд засудзіў польскага ксяндза на 7 месяцаў у турму. Нядаўна адбыўся працэс ксяндза Бахоты ў гарадзкім судзе ў Ланцуце. У судзе разглядалася казаньне кс. Бахоты, у якім ён дня 18.VI. с. г. абразіў урад. Суд кс. Бахоту засудзіў на 7 мес. у турму і 1000 зл. кары.

КООПЭРАЦЫЯ ПЕРАМАГАЕ І КРЫЗЫС!

Знаецеся на коопэрацыі? Яшчэ сягоньня запішэцеся на беларускі 5-цімесячны Завочны Коопэратыўны Курс пры рэд„САМАПОМАЧЫ“

Вільня, Полацкая 4—10.

Навучаньне пачынаецца ўжо 1.XII.1933 г.

З заграніцы.

Эўропа чакае на выступленьне Францыі. Новы францускі ўрад соцыяліста-радыкала Сарро дастаў давер у парляманце невялікай большасьці. Гэта абазначае нятрываласьць гэтага ўраду, які ня ясна прадстаўляе сваю палітыку, асабліва палітыку заграничную. Агулам у Эўропе цяпер ніхто ня ведае, якімі шляхамі пойдзе заграпічная палітыка новага францускага ўраду. Адно можна сказаць, што Амэрыка і Англія робяць на Францыю сільны націск у кірунку згоды яе з Нямеччынай. Амэрыка і Англія загразілі Францыі адасабленьнем, калі яна ня згодзіцца на такі разаружны дагавор, на які магла згадзіцца і Нямеччына.

Гэнае намаганьне Англіі і Амэрыкі выклікала ў Францыі палітычны непакой. Францускія палітычныя кругі разумеюць, што далей ужо перацягваць палітычнай струны ня можна, каб ня ўрвалася і трэба рашацца: або йсьці па лініі авантурнай, падтрымліваючы бальшавіцкія камбінацыі, або ўзяцца за супрацоўніцтва з найсільнейшымі чынынікамі ў Эўропе — Англія, Італія і Нямеччына.

Гэткае палажэньне Францыі зразумелі ўжо і дзяржавы Малой Антанты, якія, разам з Польшчай, стараюцца стварыць гаспадарча-палітычны блёк ад Балтыцкага мора аж на Балканы.

Вяртаючыся йшчэ да Францыі можна спадзявацца, што яна паразуменьня з Нямеччынай не адкіне. А гэтага цяпер у Эўропе ўсе чакаюць з напружэньнем.

Плебісцыт і парлямэнцкія выбары ў Нямеччыне. У нядзелю 12 г. м. адбыліся ў Нямеччыне выбары ў парлямэнт і плебісцыт, якім народ выказваўся за сучасную заграничную палітыку ўраду Гітлера і процiў гэтай палітыкі.

Выбары гэтыя парлямэнцкімі, бязумоўна, назваць ня можна, бо ня было каго выбіраць, а быў толькі адзін сьпісак гітлераўскай партыі. Дык выбаршчыкі маглі галасаваць толькі на адзін сьпісак—нацыянал-соцыялістычнай партыі, або дэманстраваць супроць гэтай партыі, кідаючы белыя карткі ці ўстрымліваючыся ад галасаваньня. У справе плебісцыту былі карткі „так“ і „не“.

І вось афіцыяльны камунікат падае, што на 44.850.000 выбаршчыкаў галасавала 43.007.577 асоб, з гэтага 39.655.288 галасоў за сьпісак гітлераўцаў, а рэшта 3.352.289 галасоў ня важных—выразьней: праціўнікаў сучаснага рэжыму. У плебісцыце 43.464.420 асоб сказала „так“, а 2.055.364 асобы „не“. З уведзеных лічбаў выглядае, што гэтыя свайго роду выбары хоць і ня былі выбарамі, выканалі ў поўні заданьні, якія мелі на мэце кіраўнікі нямецкай палітыкі: даказалі сілу і ўплывы нацыянал-соцыялістычнай партыі ў нямецкім народзе.

Новы рэйхстаг будзе складацца з 660 паслоў.

Адозва Гітлера. Пасьля галасаваньня канцлер Гітлер выдаў адозву да нямецкага народу, у якой выражае падзяку за гістарычнае выступленьне народу з дамаганьнем мі-

ІМЯНІНЫ ЎВА СЬНЕ.

Ня спалася дырэктару Рыжавусу. Дый ня дзіва. Заўтра яго імяніны. Сяньня з кансысторскай ініцыятывы (а ўзапраўды яго самога) быў скліканы бацькаўскі камітэт, на якім вынесена рэзалюцыя: сьвяткаваць імяніны.

Ня спалася Рыжавусу, як кожнаму, калі сумленьне чорнае, як сажа. Дый ня першы раз гэта. Даўно ён занепаў на бяссоньніцу. А ўсё праз гэтае сумленьне.

Навонкі выяўляўся псыхічны стан у Рыжавуса што раз большым запададжніцтвам. Разумеў аднак ён, што плазам гэта яму ня пройдзе. Дык нэрвы ў апошнія часы так расхадзіліся, што не давалі заснуць.

І сягоньня Рыжавусы толькі над раніцу здрамнуў. Ня спаў, а ўпаў у нейкую хворую дрымоту. І здалося яму, што ён ужо на імянінах у школе, сядзіць за сталом, а навокал вучыцялі, вучні, напроці-жа верная яго спабернічка і правая рука п. Кансысторская. Льюцца прамовы. Вучні падносяць дар — прыгожа вышываную Пагоню.

Расчуліўся Рыжавусы. Прыемны туман дрымоты ўспакоіў нэрвы і ён пачаў думаць, што адказаць на прывітаньні і пажаданьні. Падняўся і акінуў усіх вокам. І... тут разам згодна задрыжэлі, як кісель, яго ногі, а па целе пашлі мурашкі. Бо, дзе-ж падзеліся ўздельнікі ўрачыстасьці?

Дарма Рыжавусы азіраўся кругом. Нават Кансысторская і тая, як скрозь зямлі праваліласа. А навокал яго былі зусім іншыя, чым перад хвілінаю твары. Сядзелі цяпер вокал Рыжавуса тыя, якіх воблікі няраз праносіліся перад ім у бяссонныя ночы разам з абразамі паліцэйскай гаспадаркі ў школе, — гэта выгнаныя ім вучні. І вось падняўся адзін з іх і пачаў гаварыць:

„Вітаю цябе, Рыжавусы, вялікі вучыцель здрады і грабар беларускай справы. Вітаюць цябе ўсе тут сабраўшыяся вучні — выгнанцы, якім ты каліс скалечыў душу камсамольскай атрутай, а пасьля скрывіў і ўслаў цернямі іх жыцьцёвую дарогу, выганяючы са школы з воўчым білетам. Шмат, бясконца шмат учыніў ты школы беларускай моладзі і бел. народу. Другі на тваім месцы даўно павесіўся-б; яму не дало-б жыць сумленьне. А ты яшчэ жывеш, гадуеш бруха і замест таго, каб направіць зло, каб адпакутаваць, яшчэ болей шкодзіш, дэмаралізуеш моладзь, прывучаючы яе да п'янства і прадажніцтва, бескантрольна распараджаешся грамадзкім дабром, прадаеш і прававуеш за юдавы срэбнікі бел. народ. Але, глядзі! Час суду блізкі. І прысуд будзе срогі, ды кара ня міне цябе — не сягоньня дык заўтра“.

Спужаўся Рыжавусы і пачаў агглядацца, шукаючы ратунку. Але яго акружалі маўкліва-суровыя твары дзяцей, якіх тут было мноства, больш сотні і якія абступілі яго з усіх бакоў. Зірнуў у бок Рыжавусы і сэрца ў яго задрыжэла. Бо вось, пастаўленая да сьцені ў куце Пагоня раптам ажыла, вырасла пад самую столь, а рыцар, сьціраваўшы вастрыё кап'я на Рыжавуса, рынуў з імпэтам на здрадніка. Ня стрываў Рыжавусы і зароў з перапуду, як бык, каторага рэжуць.

„Чаго ты равеш, як скаціна — забурчэла Антаніна — напіўся ўчора, як шавец, са сваімі гадунцамі-фуксамі!“ — Рыжавусы прачнуўшыся маўчаў і зьнямажана дыхаў, а з лобу ў яго сьцякалі і падалі на хараша вышыгафтаваную посьцелку, вялікія кроплі поту.

Вучань-Ігной.

ру і вечных правоў роўнасьці Нямеччыны. Адначасна Гітлер выразіў падзяку і выказаў заслугу штурмовых батальёнаў і Штальгэльму, запэўняючы іх, што будучыня прызнае ім вялікую заслугу за ўратаваньне бацькаўшчыны.

Італія сьледам за Нямеччынай. На апошнім паседжаньні конфэрэнцыі разбраеньня прадстаўнік Італіі Сораня заявіў, што ў камісіях конфэрэнцыі італьянскіх тэхнічных супрацоўнікаў трэба ўважаць за обсэрватараў. Гэту заяву ўважаюць роўназначнай з выступленьнем Італіі з конфэрэнцыі разбраеньня.

Савецкая палітыка ў Эўропе і на Далёкім Усходзе. Савецкая загранічная палітыка ў апошнія часы выяўляе нязвычайнае ажыўленьне. Бальшавіком апошнімі гадамі Японія штораз мацней пагражае на Далёкім Усходзе. Дзеля гэтага Саветы ўсе сілы зьвярнулі, каб забясьпечыць сабе тылы ў Эўропе, дзеля гэтага бальшавікі і стараюцца добра жыць з буржуямі. Сяньня кожнаму ясна, што бальшавікі заключаюць дагаворы супакою таму, бо сьмяртэльна баяцца вайны, якая можа зруйнаваць Саветы дашчэнту і зьнішчыць у Расеі камуністычны лад. Ведама так-жа ў Эўропе і тое, што бальшавікі заключаюць дагаворы аб ненападаньні толькі таму, каб забясьпечыць сябе самых, а ня мір у Эўропе.

Гандлёвыя дагаворы на большую скалю маюць бальшавікі ў Эўропе толькі з Нямеччынай і Італіяй. Цяпер, як трэці аматар інтарэсаў з бальшавікамі, мае прыбыць Францыя.

У Францыі зблізжэньне з Саветамі разглядаецца толькі з пункту гледжаньня гандлю і інтарэсу. Дзеля гэтага французы ў Маскве адразу і паставілі справу француска-савецкага збліжэньня пад зорным кутом добрага інтарэсу. Саветы могуць дастаць у Францыі пазычку за добрыя працэнты і за гэту пазычку купіць у Францыі тавары. Апрача гэтага, трэба даць Франпыі канцэсіі ў С.С.Р.Р. і прызнаць царскія даўгі. Бальшавікі быццам на гэта згаджаюцца і ад Францыі аднаго галоўнага жадаюць: гваранцыі, што Францыя не дапусьціць да выступленьня ў Эўропе процiў Саветаў.

Адначасна, забясьпечваючыся ў Эўропе, вяліся тайна перагаворы савецка-амэрыканскія. Бальшавікі выкарысталі добры час: гаспадарчую катастрофу ў Амэрыцы і амэрыканска-японскае нездаваленьне на Далёкім Усходзе.

Амэрыка прызнала Саветы "de iure" і пачаліся гутаркі так-жа пад зорным кутом інтарэсу, каб пагандляваць. Аднак і гэткае збліжэньне Амэрыкі з Саветамі, на Далёкім Усходзе зрабіла карыснае для Саветаў уражаньне. Адразу спыніліся ўсялякія правакацыі Японіі процiў бальшавікоў.

Адчуваючы гэткія карысьці для Саветаў з амэрыканска-савецкага паразуменьня, у Амэрыку да прэзыдэнта Рузвэльта паехаў з Саветаў сам камісар Літвінаў, каб гэтую прыязьнь падмацаваць і прадоўжыць на далейшы час.

Перагаворы Літвінава з Рузвэльтам. Перагаворы Савецкага камісара Літвінава з прэзыдэнтам Зл. Шт. Амэрыкі Рузвэльтам ідуць вельмі туга. Дагаварыўшыся, што абедзьве дзяржавы ня будуць вясьці прапаганды на тэрыторыі кожнай з іх і навяжуць дыплёматычныя зносіны, іншыя важнейшыя справы пакінулі на далей.

Газэты падаюць, што перагаворы гэтыя ўжо натрапілі на паважныя труднасьці, якіх Саветы ніяк ня могуць перамагчы. Некаторыя газэты дагадваюцца, што тут прыслужылася нямецкая дыплёмацыя, каб запыніць бальшавікоў ды стрымаць іх палітычны разгон.

З ВІЛЬНІ.

Транзакцыйныя цэны з збажжова-таварнай біржы ў Вільні з дня 14 Лістапада 1933 г.

(*Цэны за 100 кілё*).

Мука жытняя да 55 проц.	25,50
Мука жытняя да 65 проц. . .	20,50—21,50
Мука жытняя разовая	17,50—18,00
Семя льняное	36.17

Курс грашэй: дня 14.XI.33. за даляр плацілі 5 зл. 57 гр., за рубель залаты 4 зл. 72 гр.

Гарадзкая пошта хутка мае быць заведзена ў Вільні. Пісьмо ўкіненае да 12-ай гадз. ў скрынку гэтай пошты даручаецца таго самага йшчэ дня. Аплата гэткіх пісьмаў 15 гр., адкрытак —10 гр.

Да нас пішуць.

Жыве і наша ваколіца.

Новы-Пагост, Браслаўскага пав. Даходзіць і да нас „Бел. Крыніца", будзячы нашых людзей да жыцьця. З сваей роднай газэты даведваемся аб жыцьці беларусоў з усіх куткоў нашай краіны. Цікавяць нас весткі аб працы культурна-прасьветнай сярод беларусоў па сёлах і адначасна робіцца стыдна, што ў нас гэткай працы пакульшто няма. У нашай ваколіцы ўжо многа ёсьць сьведамых беларусоў, але роднай беларускай арганізацыі яшчэ няма. Дагэтуль культурна-прасьветная праца праводзіцца ў нас саматугам — неарганізавана. Чытаюць сяляне родную газэту і свае беларускія кніжкі. Сёлета ўжо былі ў нас і двойчы беларускія прадстаўленьні: 2 ліпня і 14 кастрычніка. Народу на прадстаўленьнях было многа, а моладзь у ролях прадстаўленьня вельмі ўдала паказала абразкі сцэнічных твораў.

Слава вам, хлопцы і дзяўчаткі! Не пакідайце працы на ніве нашага беларускага адраджэньня. Каб лягчэй было вам працаваць, залажэце гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. *Тутэйшы.*

Хто разбурае Царкву.

Чэрэса, Браслаўскага пав. Чорнасоценскія расейскія газэты крычаць, што ўкраінцы і беларусы, дамагаючыся справядлівасьці ў царкоўным жыцьці, разбураюць царкоўнае жыцьцё і Царкву. Мне здаецца, што гэта ня праўда, бо Царкву і царкоўнае жыцьцё разбураюць знутра, дзе ані беларусоў ані украінцаў пакульшто няма.

У мінулым годзе прызначаны ў Віленскую кансысторыю прат. Грамадскі, кандыдат па непаразуменьню ад беларусоў. Меўся ён паправіць тое, што напсавалі яго папярэднікі. Аднак, замест направы суадносін духавенства з народам, прат. Грамадскі пачаў „усердно" папраўляць кансысторскую касу, змушаючы націскам духавенства, каб плаціла царкоўныя даўгі Кансысторыі. Тых сьвяшчэньнікаў, што ня мелі грошай, звольнілі з становішчаў.

Цікава, што-б сказаў сам Грамадскі, каб яго цяпер пакінулі без становішча і брат ня даў-бы запамогі. Ці ён-бы таксама быў верны гэтым устарэлым кансысторска-чыноўніцкім парадкам, ці шукаў-бы справядлівасьці.

Разбураць духавенства і адганяць яго ад царквы Грамадскі ня мае права і аб гэтым ён павінен ведаць. Царкоўнік,

Panskaje kino i hurtok B. I. H. i K.

Walaŭka, Nawahradzkaha paw. Ad samaha pačatku polskich uładaŭ u našym Kraju pryjechali da nas polskija wučyciali wučyć biełaruskich dziaciej. Mała taho, što jany robiać swaju rabotu ŭ školach, ale ciapier zajmajucca pazaškolnaj dziejnaściaj — tworać z biełaruskaj moładzi polskija arhanizacyi. Kab zaachwocić našu moładź u swaje „koły," 24.X. s. h. naładzili jany ŭ nas kino. Prywieźli adniekul na aŭtamabili mašynku L.O.P. i pačali wyświatlać film. Nabrałasia i našych ludziej, ale jak stała ciesna, dyk našych wyprasili z chaty i hladzieli adny pany.

Naša moładź sabraŭšysia pahawaryła miž saboj ab hetym kinie i pastanawiła zarhanizawać swoj hurtok Bieł. Inst. Hasp. i Kultury. Na zaŭtra napisali zajawu, padpisali jaje i pasłali na zaćwierdžańnie. Dyk woś čakajem i hadajem — zalehalizujuć ci nie zalehalizujuć ułady našu arhanizacyju. A arhanizacyja dla našaj moładzi patrebnaja. A. W.

Ciomnyja siły pracujuć.

Skidel—Ščučyn. Biełaruskaja świedamać siarod našaha narodu raście. Najhoršym woraham jaje źjaŭlajucca roznyja „bogoojczyźnianyja" polskija arhanizacyi i niawyraznyja padpolnyja „wyzwalenčyja ruchi," jakija, nia wyjaŭlajučy adkryta swaje ideolohii, časta źbiwajuć narod z jahonaha sapraŭdnaha šlachu. Jak pieršyja tak i druhija starajucca zdabyć dla siabie jak najbolš staronnikaŭ. Dziela wypaŭnieńnia hetaha „zadańnia" pracujuć časta specyjalisty, jakija ŭ swaich starańniach dachodziać nawat da teroru; pry tym jany wielmi wostra wystupajuć prociŭ „Biełaruskaje Krynicy." Dasiulešnija adnak ichnyja ŭdačy pačynajuć patrochu maleć i dumaju, što jany zusim zaniknuć, bo narod razroźniwaje ŭžo dabro i zło i biazumoŭna zrazumieje, što niezaležnickaja ideolohija, jakuju prapahuje „Biełaruskaja Krynica," dla nas biełarusoŭ jošć najbližejšaj. W. Pahonščyk.

„Беларуская Газэта."

Выходзіць у Вільні нейкага Карповіча „Беларуская Газэта" і кожны раз робіць шмат крыку і на ўсе лады выкрыківае, што Беларусы сябруюць з Гітлерам, і намагаюцца выклікаць вайну з Савецкай Расеяй.

З гэтага бачым, што зайшло непаразуменьне. Пан Карповіч, як відаць, ня ведае чаго Беларусы хочуць.

Вось жа Беларусы хочуць на сваёй зямлі быць самі гаспадарамі!!! Гэта ўвесь зьмест беларускай праграмы, беларускіх імкненьняў.

Дык запэўняем п. Карповіча, што мы ня будзем мець ніякіх прэтэнсыяў ані да т. Сталіна, ані да яго камуны і дыктатуры, калі яны ўсе разам пакінуць наш народ самому сабе. Хай яны свае экспэрымэнты праводзяць ў сваей Маскоўшчыне.

Мы змагаемся не з т. Сталінам, ні з т. Карповічам, бо яны нас самі па сабе сусім ня цікавяць, мы змагаемся за вызваленьне нашага народу. Мы ня хочам «бойні людзей.» Мы супроць гэтага змагаемся. Мы хочам, каб маскалі і іх янычары зьліквідавалі свае „бойні" сярод беларускага селяніна і работніка. Мы ня хочам, каб наш селянін ішоў праліваць кроў за рэвалюцыйныя экспэрымэнты т. т. Сталінаў ды Карповічаў сярод нэграў ці кітайцаў, бо ані нэгры з кітайцамі над падняцьцем нашага дабрабыту і культуры не працуюць, і ані мы не патрабуем нейкіх чужых нам дабрадзеяў. Сваім потам і крывёй мы зросім свае палеткі на пажытак нашым унукам. Нэгры і кітайцы хай-жа зробяць тое самае. Калі-ж т. Карповіч іх шкадуе, мае інтэрнацыянальнае сэрца — хай хоць сяньня адпраўляецца да іх і памагае ім, чым можа. Мы астанемся пры сваім народзе, будзем яму служыць, бо ён, беларускі народ, нам даражэйшы, чымся нэгр ці кітаец. Т. Карповіч можа сабе змагацца за сусьветную рэвалюцыю, за тысячамэтровыя фабрычныя коміны, за дыктатуру Саловак і г. д. Мы будзем змагацца, каб даць свайму народу волю, зямлю, школу, працу і хлеба. Калі мы ўсё гэта будзем мець, то тады і самі, бяз т. т. Сталіных і Карповічаў, даведаемся каму памагчы і якім чынам. Сяньня-ж мы хочам перадусім стаць самі на ногі.

Беларусу ўжо непатрэбны нянькі. Хай таварышы Сталіны наперад ашчасьлівяць свой народ, а народ беларускі пакінуць вольным, ён і бяз «добрага" сэрца т. т. Сталіных ды Карповічаў зможа сам сябе ашчасьлівіць. Урэшце, што да захапленьня Гітлерам, дык можам сказаць: мы захапляцца кімсьці ня маем часу, мы верым у свае ўласныя, у свае беларускія сілы і мазалі. Гітлер нам, беларусом, нічога благога не зрабіў, а калі наступіў на хвост нейкай сусьветнай рэвалюцыі т. Сталіна ці Карповіча, то з якой прычыны мы, беларусы, маем супроць гэтага пратэставаць. Маем шмат спраў, якія датычаць наш народ і яго вызваленьня, і гэтым перадусім мы цікавімся. Калі-ж т. Карповіча так цікавіць гітлерызм, дык хто яму забараняе паехаць у Нямеччыну і там заклікаць немцаў да барацьбы з Гітлерам? Мы, беларусы, тут ні пры чым, бо ані мы гітлерызм стварылі, ані мы яго будзем ліквідаваць.

Тав. Карповіч хоча ашчасьлівіць нэграў ці кітайцаў, — калі ласка, мы нічога супроць ня маем; хоча біць паклоны Сталіну—таксама можна яму гэта рабіць, няхай кланяецца. Але, каб гэта рабіў і Беларускі народ, дык сапраўды трэба быць выгнаным з хаты, каб адважыцца аб гэтым у цяперашнія часы пісаць у газэце. А тав. Карповіч аб гэтым папліць у кожным нумары „Беларускай Газэты." **Беларускі студэнт.**

Можна зарабіць купіўшы гуртам па 45 гр. за штуку **БЕЛАРУСКІ АДРЫЎНЫ КАЛЕНДАР** на 1934 г. у Беларускай Кнігарні „Пагоня"— Вільня, Завальная 1—1, — прадаючы яго на правінцыі ў розьніцу па 60 грашоў за штуку.

Рэдактар Ян Пазьняк.

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.

Выдавец А. Шутовіч.